2. *Волк, А. А.* Книгоиздательское дело в Белоруссии: исторический очерк / А. А. Волк, А. И. Ракович. – Минск : БГУ им. В. И. Ленина, 1977. – 280 с.
3. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): документы и материалы. – Минск : Беларусь, 1978. – Т. 2. – Кн. 2. – С. 203.
4. *Гусев, В. Е.* Славянские партизанские песни / В. Е. Гусев. – Л. : Наука. Ленингр. отд-ние, 1979. – С. 6.
5. *Дедюля, И. П.* Партизанский фронт / И. П. Дедюля. – М. : Мол. гвардия, 1975. – 320 с.
6. *Марцелев, С. В.* Печать Советской Белоруссии: исторический очерк / С. В. Марцелев. – Минск : Беларусь, 1967. – 512 с.
7. *Осипов, Б. В.* Биография пишется смолоду / Б. В. Осипов. – М. : Политиздат, 1979. – 102 с.
8. *Саченко, И. И.* Война и публицистика / И. И. Саченко. – Минск : Наука и техника, 1980. – 280 с.
9. *Стасевіч, З. Р.* Лясныя выданні / З. Р. Стасевіч // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1980. – № 1. – С. 10.

*S. PAULAVA*

## ACTIVITY OF THE BELARUSIAN PUBLISHING HOUSES DURING THE GREAT PATRIOTIC WAR

*The study is devoted to the publication of books and periodicals in 1941–1945. The author examines issues of the publication, distribution, ideological content of printed materials of Belarus in state publishing houses as well as in guerilla printing houses. The role of the printed word in patriotism and education strengthening, the outlook and moral spirit of the Motherland defenders' formation are highlighted. The analysis of publications, their quantitative and qualitative indicators making a conclusion about the status and the development of printing during the war period is made.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 26.03.2015.

УДК [002.1+002.2]:[165.194+17.022.1]

*Л. І. ДОЎНАР*

## КНІГА І ДАКУМЕНТ У КАНТЭКСЦЕ КАГНІТЫЎНА-АКСІЯЛАГІЧНАГА ПАДЫХОДУ

*Асноўная ўвага ў артыкуле сканцэнтравана на праблемах сутнаснага парадку пры суадносінах кнігі і дакумента, якія прэзентуюцца з пункту гледжання маральнай адказнасці ў фарміраванні навуковых канцэпцый і развіцця цывілізацыйных працэсаў: іх каштоўнасці і значнасці, духоўнасці, маральнасці, свабоды слова, актыўнасці і пасіўнасці, публічнасці і прадвызначэння, кіравання быццём і тварэння быцця. Робіцца акцэнт на аўтаномнасці кнігі праз яе пазнанне ў кніжнай культуры; праз веды, неабходныя для развіцця грамадства.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кніга і дакумент, якія з’яўляюцца аднымі са старажытных аб’ектаў пазнання і асэнсавання (ад антычнай навукі), у адносна недалёкім мінулым сталі асновай развіцця адпаведна самастойных навук – кнігазнаўства (бібліялогіі) і дакументазнаўства (дакументалогіі). Пад уплывам знешніх фактараў фарміраванне тэарэтычных ведаў у дадзеных навуках знаходзіцца на мяжы пэўнага супрацьстаяння ў сувязі з тым, што дакументалогія стала прэтэндаваць на ўсеахопнасць і нават усезахопнасць у адносінах да аб’екта бібліялогіі – кнігі, якая аказалася ўключанай у сістэму розных тыпаў і відаў дакументаў, стаўшы адным з іх, а ў самой навуцы пра кнігу «дакумент» замацаваўся як сінонім кнігі.

Чым вышэй мяркуемы ўзровень абагульненняў, метатэорый – дакументалогія, тэорыя інфармацыі і сацыяльнай камунікацыі, інфарматалогія, камунікалогія [14, 16, 18], тым большую ступень уніфікацыі атрымліваюць і асноўныя тэрміналагічныя паняцці кнігазнаўства, узнікае рэальная пагроза аб’яўлення іх архаічнымі ці наогул знікнення. Як ставіцца да такога развіцця навуковых ведаў? Чаму так адбываецца? Гэта эвалюцыя «дакумента» ці энтрапія «кнігі»? Як звязана развіццё навуковых ведаў, канцэпцый, тэорый з цывілізацыйным развіццём чалавецтва?

Задаўшы пытанні: у якім грамадстве мы сёння жывём, якое грамадства будуем, ці можам мы адказаць з упэўненасцю, што гэта – інфармацыйнае грамадства (куды лагічна ўпісваюцца інфарматалогія і ўсеабдымная інфармацыя), грамадства ведаў (у якім дзякуючы новым камп’ютарным тэхналогіям вызваляецца розум для ўдасканалення чалавека) ці ўсё ж гэта – грамадства спажывання (дзе кожны з’яўляецца спажыўцом – у тым ліку інфармацыі, тэхнікі, зручнасці і камфорту); грамадства, якое спарадзіла такія праблемы, як «дысфункцыя чытання, дэвальвацыя кнігі, дэгуманізацыя сацыяльнай камунікацыі» [13, с. 43–44]?

Дазволім невялікае адступленне, каб вобразна, на прыкладзе пераказанага эсэ Паўла Абрамовіча [1] паказаць адказнасць асобы за развіццё сучаснай цывілізацыі. Атрымліваючы Міжнародную прэмію Каталоніі, японскі пісьменнік Харукі Муракамі, чые кнігі перакладзены на 40 моў свету, адзначыў у прамове, што аварыя на АЭС «Фукусіма-1» стала наступствам калектыўнай памылкі яго суайчыннікаў: «Пасля Хірасімы і Нагасакі мы павінны былі ўвесь час гаварыць “не” ядзернай энергіі. Але мы сваімі рукамі паўтаралі памылку». 25 гадоў таму беларускі пісьменнік Алесь Адамовіч рабіў усё магчымае, каб зменшыць наступствы Чарнобыля. Пісаў Міхаілу Гарбачову, выступаў з публіцыстычнымі артыкуламі, рыхтаваў кінасцэнарый, удзельнічаў у навуковых канферэнцыях, каб увесь свет даведаўся аб трагедыі 1986 г. Адамовіч дакараў і сябе, бо абвостранае пачуццё не толькі калектыўнай, але і персанальнай віны характэрна для кожнага пісьменніка. Гэта толькі на першы погляд здаецца, што камяні і не зрушыліся нават, і бакі іх засталіся такімі ж вострымі. Некалькі гадоў назад ніхто б не паверыў, што Германія – адна з самых моцных эканомік свету – адважыцца закрыць усе свае АЭС у бліжэйшыя гады. Гэта адбылося і дзякуючы пратэстам грамадскасці, і інтэлектуальнай працы многіх людзей, у тым ліку і кнігам беларускай пісьменніцы Святланы Алексіевіч, чыя кніга «Чарнобыльская малітва» зацвердзілася ў нямецкіх кніжных «топах». Рана яшчэ казаць пра поўную перамогу нават у асобна ўзятай краіне. Але, як заўважае Х. Муракамі:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«…не трэба баяцца мары. Нельга, каб нас, як статак, вечна паганялі злосныя сабакі, якіх клічуць “эфектыўнасць” і “зручнасць”».

Не здымаецца і адказнасць вучоных як за развіццё грамадства, так і за фарміраванне навуковых канцэпцый, якія знаходзяцца з ім ва ўзаемасувязі і ўзаемаўплывах. «Як назавеш, так і паедзеш», а як далёка, у якім кірунку – гэта залежыць і ад нас.

Разгляд і аналіз навуковых канцэпцый, якія аказалі значны ўплыў на фарміраванне і прыярытэтны сёння стан дакументалогіі, акрэсліваюцца наступнымі асноўнымі навуковымі кірункамі [12, с. 1]: прававым, крыніцазнаўчым, гнасеалагічным (ці кагніталагічным, эпістэмалагічным) і кіраўніцкім. На наш погляд, мэтазгодна звярнуць асаблівую ўвагу на гнасеалагічны ці кагніталагічны падыход, які актуалізаваў не толькі выкарыстанне тэрміна «дакументальная інфармацыя» ў галіне кнігазнаўчай дзейнасці, але і прэзентуецца, развіваецца, прапаноўваецца сёння некаторымі вучонымі як жыццёва важнае ўсведамленне значнасці і вырашэння навуковых і практычных праблем, з якімі сутыкнулася кніжная камунікацыя [13, 15], а таксама як пошук тэарэтычных і метадалагічных кампрамісаў у развіцці навукі пра кнігу ў XXI ст. [7], прытрымліванне аксіялагічнай і кагнітыўнай сутнасці кнігі і кніжнай культуры [2, 3, 10].

Сваімі каранямі кагніталагічны кірунак сягае яшчэ да даследаванняў старажытнагрэчаскіх філосафаў (Платона і Арыстоцеля), стварыўшых падставу для ўсведамлення пісьма і яго вынікаў як працэдуры пазнання. У Сярэдневякоўі разуменне каштоўнасці і значнасці кнігі звязана з сакралізацыяй пісьма, кніга ж разглядаецца як сімвал «откровения», трансцэндэнтнай таямніцы. Не дарэмна першай друкаванай кнігай была Біблія, а яе пераклад на іншыя мовы садзейнічаў фарміраванню алфавіта і пісьменнасці. «Да будет совершенен человек», – пісаў Францыск Скарына. «Различны книги нам суть Богом преложены / Да благонравно жити будем научении», – трактуе кнігу Сімяон Полацкі [цыт. па: 10, с. 50]. Дамінуе каштоўнасць кніжных ведаў у пазнанні светабудовы, культ кнігі. У эпоху Новага часу вялікі ўплыў мелі працы філосафаў, перш за ўсё Готфрыда Лейбніца: кніга – крыніца ведаў, сімвал мудрасці і навучання.

У пачатку – першым трыццацігоддзі XX ст. разуменне каштоўнасці і значнасці кнігі атрымала далейшае развіццё ў навуковым кнігазнаўчым асэнсаванні, паглыбіўшыся ў сутнасную катэгорыю «чалавечай думкі», якая стала асновай паняцця «кніга» ў А. М. Лавягіна. Кніга разглядалася і з пункту гледжання матэрыяльнай формы, і як сацыяльная з’ява М. М. Лісоўскім. Паводле слоў Міхаіла Куфаева, які стаяў ля вытокаў метадалогіі бібліялогіі – філасофіі кнігі, сказаных у 1921 г.: «Правильнее всего понимать книгу как вместилище всякой мысли и слова, облеченных в видимый знак, все то, что могло бы при некотором техническом видоизменении получить вид и характер книги в самом узком смысле этого слова. И ассирийская клинопись, и латинский свиток, и современный фолиант и брошюра, и афиша – все книги» [5, с. 61–62]. У шырокім сэнсе кніга – з’ява, у якой пры дапамозе бачнага знака зафіксаваны думка і слова, узятыя разам. М. Куфаеў застаецца на пазіцыі прыхільніка паняцця «кніга», якой уласцівы не толькі вынік (ім яна і з’яўляецца – замацаванай думкі), але і бясконцы працэс тварэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Блізкі да дадзенай трактоўкі і Поль Атле: «Книга как письменное выражение идей, инструмент их фиксации, их хранения, их обращения является посредником, обязательным в отношениях между людьми» [11, с. 187]. Пад уплывам філасофіі прагматызму, калі праўдзівасць звязвалася з карыснасцю (Ч. Пірс, У. Джэймс) [12, с. 2–5], універсалізм кнігі і рацыяналізм (імкненне ўнесці парадак у «горы» папер і дакументаў, стварыць «металургію» прачытаных папер) для П. Атле становяцца абгрунтаваннем ідэі стварэння адзінага свету ведаў адкрытага доступу – Дакументацыі (ці Універсальнай Сеткі Дакументацыі), дзе састаўнымі элементамі з'яўляюцца Кніга і Дакумент, а агульнай навукай і тэхналогіяй – Бібліялогія ці Дакументалогія [11, с. 189]. Як адзначыў П. Атле, універсалізм кнігі, яе шматфункцыянальнасць, дыялектычная сувязь матэрыялу, формы і зместу складаюць яе сілу і жыццёвы патэнцыял [19], што і пацвярджае заключнае слова «Трактата о Документации»: «"Книга" – средство универсальности, повсеместности, вечности» [11, с. 308].

З другой паловы і да канца ХХ ст. у кнігазнаўстве развіваюцца функцыянальная і структурна-тыпалагічная канцэпцыі, прадстаўнікі якіх, асабліва сярод рускіх і польскіх вучоных (напрыклад, І. Я. Барэнбаўм, А. І. Барсук, С. П. Амілянчук, А. А. Белавіцкая, А. А. Грачыхін, Я. Л. Неміроўскі, К. Гламбёўскі, К. Мігань), у межах даследаванняў выходзяць як на міждысцыплінарнае, так і культуралагічнае разуменне «кнігі», разглядаючы яе як інструмент камунікацыі ў рэалізацыі разнастайных функцый, сродак замацавання моўнай і візуальнай інфармацыі. Актывізацыя ж у гэты час і інфармацыйна-дакументазнаўчай парадыгмы «справакавала» спецыялістаў у галіне інфарматыкі, бібліяграфіі і бібліятэказнаўства на ўвядзенне абагульняючага паняцця «дакумент». У некаторым сэнсе механічна ў дадзеных дысцыплінах адбываецца замена паняцця «кніга» на «дакумент», паняцця «чытач» на «спажывец інфармацыі» і г. д., у выніку ўжо ў першым дзесяцігоддзі ХХІ ст. «Дакументазнаўства» становіцца дысцыплінай у ВНУ, якая ўключае і нават замяняе «Кнігазнаўства». Традыцыйныя назвы «бібліятэчных» ВНУ (школ, інстытутаў, факультэтаў) замяняюцца на інфармацыйна-дакументныя ці навуковай інфармацыі [18, с. 201].

Сёння кнігазнаўцы выказваюць занепакоенасць тым, што такая даволі небяспечная тэндэнцыя праяўляецца «во все более настойчивых попытках подмены объектно-предметных основ комплексной науки о книге», якая сыходзіць ад так званай шырокай канцэпцыі дакументазнаўства, дзе кніга лічыцца адным з відаў ці разнавіднасцей дакумента [6, 17], што цалкам «размывает существо предмета и вносит хаос в исторически устоявшиеся представления о том, что есть книга, а что есть документ» [7, с. 222].

Адбываецца не проста ўніфікацыя тэрміналогіі, але, па сутнасці, толькі ўзводзяцца разнастайныя канструкцыі дакументальнай прасторы. З'ява не пазнаецца, а «конструируется под флагом междисциплинарности, при этом прочность конструкции определяется голосованием» [12, с. 12]. Пацвярджэннем гэтаму могуць служыць прыклады трактоўкі паняцця «кніга» як кніжнага выдання (у Н. М. Кушнарэнкі) [6, с. 219, 227] і таксама, нягледзячы на дыферэнцыяцыю паняцця «кніга» па асаблівасцях матэрыяльнага носьбіта інфармацыі, асаблівасцях знакавай формы і ўспры-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мання чалавекам (Кніга I, II, III, IV, V, VI), якую прэзентуе Г. М. Швяцова-Водка, а ў выніку канстатуе, што «книга – это документ опубликованный, изданный или депонированный…» [17, с. 258]. Умоўнымі для кнігазнаўства з'яўляюцца і прапанаваныя дакументазнаўцамі такія паняцці (запазычаныя з тэорыі інфармацыі і сацыяльных камунікацый), як «камунікант», гэта значыць аўтар, і «рэцыпіент» – чытач. Калі ў дакументалогіі такая ўніфікацыя можа быць апраўданай, то ў кнігазнаўстве яна непрымальная і ў тэорыі, а тым болей на практыцы (напрыклад, выдавецкай). Канвенцыяналізм у дадзеным выпадку не праходзіць, як і з тэрмінам «дакумент», які для зручнасці выкарыстання вызначаецца як «запісаная інфармацыя» [12, с. 11]. А якое ж значэнне ў гэтым выпадку будзе мець «дакументная інфармацыя»?

Нягледзячы на тое, што ў шэрагу спецыяльных энцыклапедычных выданняў тэрміны «кніга» і «дакумент» трактуюцца ці выкарыстоўваюцца як сінонімы, кнігазнаўцы ўсё ж не адважваюцца іх атаясамліваць. І, як лічыць А. В. Сакалоў, такога атаяснення дапусціць нельга ні ў кнігазнаўстве, ні ў дакументазнаўстве, каб пазбегнуць анархіі і хаосу [13, с. 46].

У кожнай з навуковых дысцыплін свае вобласці даследавання, ад аб'екта і прадмета да методыкі і метадалогіі. Можна і трэба паспрабаваць задакументаваць быццё і на практыцы (як прапаноўваў П. Атле), а для гэтага, безумоўна, неабходны веды пра дакументы, іх адрозненні і асаблівасці, агульнасць, – каб апісаць, улічыць і… заставацца «статыстамі»?

Змены канцэптуальных навуковых кірункаў у галіне дакументалогіі і нават інфарматалогіі ў адносінах да бібліялогіі з'явіліся, безумоўна, не на пустым месцы [18, с. 196–201]. Абазначаныя вышэй праблемы сутнаснага парадку, як дысфункцыя чытання, дэвальвацыя кнігі, дэгуманізацыя сацыяльнай камунікацыі – як агульначалавечыя, так і навуковыя – выявіліся і працягваюць расці з распаўсюджаннем і ўзвядзеннем у галоўную мэту (а не сродак) новых тэхналогій (сёння – гэта Інтэрнэт як галоўны камунікацыйны канал, мультымедыяпрадукты і г. д.); з пераўтварэннем кнігі ў тавар, попыт на які часта вызначаецца не духоўным зместам, а рыначнай кан'юнктурай. На фоне глабальнай інфарматызацыі і камп'ютарызацыі кніжная камунікацыя выглядае, здавалася б, неканкурэнтназдольным анахранізмам, а на фоне камерцыялізаваных сродкаў масавай інфармацыі кнізе адводзіцца незайздроснае маргінальнае месца [13, с. 43; 18, с. 201–202].

Ад жадання зносін і чытання чалавек пераходзіць да жадання і нават цягі да назапашвання і спажывання. Мы становімся карыстальнікамі і спажыўцамі інфармацыі, дакумента, бібліятэкі і г. д., але не кнігі – таму што кніга ўсё ж чытаецца ці не чытаецца; у кнігі ёсць ці няма чытача. На ўзроўні асэнсавання, спасціжэння сэнсаў-прызначэнняў існуюць і развіваюцца кнігі (а не дакументы) дзіцячыя, мастацкія, вучэбныя, навуковыя, рэлігійныя і інш. На пачуццёвым узроўні, напрыклад, мы можам сказаць: «Я люблю кнігу», «Якая прыгожая кніга!» (а ці можна так сказаць пра дакумент, інфармацыю?). Былі і ёсць бібліяфілы, захопленыя калекцыяніраваннем кніг, а ці ёсць, ці з'явяцца «дакументафілы»? Таму ў дадзеным выпадку праяўляецца беспадстаўнасць інструментальнага мыслення.

Значная частка дакументазнаўчых ведаў грунтуецца на разглядзе кнігі як віду ці разнавіднасці дакумента, бо «обеспечение общества инфор-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мацией осуществляется главным образом благодаря существованию и применению в документационном процессе книги» [17, с. 248]. Хоць камунікацыйна-інфармацыйны падыход, які ў асноўным выкарыстоўваецца дакументазнаўцамі, і ўяўляе пэўную цікавасць для кнігазнаўцаў (напрыклад, параўнанне і суадносіны паняццяў, уласцівасцей і функцый «дакумента» і «кнігі», тыпалогія і відавая класіфікацыя кніжных выданняў), аднак утрымлівае і шэраг супярэчнасцей, нягледзячы на тое, што канцэптуальна імкнецца да «паглынання» «кнігі».

На наш погляд, «кніга» паказваецца даволі аднабока – з матэрыяльнага пункту гледжання і то не ў поўным аб'ёме, бо разглядаецца ў асноўным як кніжнае (друкаванае) выданне. Адсюль і канстатацыя таго, што «любую книгу можно назвать "документом", но не каждый документ "книгой"» [17, с. 262]. У дадзеным выпадку неабходна заўважыць, што сутнасць кнігі як дакумента – гэта толькі адна з яе ўласцівасцей быць дакументам, сведчыць аб чым-небудзь, а таксама выконваць адну з важнейшых функцый – дакументавання тых ці іншых з'яў. І ў гэтым сэнсе кніга выконвае, як і дакумент, пасіўную ролю, бо ў гістарычнай перспектыве толькі адлюстроўвае і захоўвае гісторыю і культуру чалавецтва, становіцца кніжным (дакументальным) помнікам (у тым ліку і навуковых ведаў), задакументаваным быццём.

А адрозненне кнігі ад дакумента і заключаецца ў тым, што адзначаецца, дарэчы, і дакументазнаўцамі, у яе актыўнай ролі ў фарміраванні грамадскай свядомасці [17, с. 286]. Актыўнасць кнігі праяўляецца ў жыццядзейнасці, удзеле ў змяненні і ўдасканаленні чалавека. У працэсе камунікацыі, калі нават абмежавана свабода слова, культывуецца «масавая культура», спажывецкія адносіны ў грамадстве, якія рэгулююцца адпаведнымі законамі (дзяржаўнымі дакументамі), роля і прызначэнне кнігі ў адносінах тварэння быцця, накіраванага на гуманізацыю чалавека, узрастае, становіцца востра запатрабаванай, і, здавалася б, за яе масавай недаступнасцю хаваецца тым не менш яе актыўнасць як пастаянная адказнасць за маральны і духоўны воблік чалавецтва.

Кніга заўсёды публічна, нават калі мае спецыяльнае прызначэнне, напрыклад, навуковая, вучэбная і г. д. Ці тады, калі забаронена да распаўсюджання, выдання, аднак існуе як з'ява і раней ці пазней становіцца ўсеагульным здабыткам. Сярод дакументаў заўсёды ёсць дакументы як для публічнага, так і для спецыяльнага (напрыклад, у кіраванні дзяржавай) распаўсюджвання.

Дакумент як доказ, выпрацаваная норма сёння і зараз можа і ўдзельнічае ў кіраванні быццём чалавека, дэтэрмінуе быццё. Але кніга (у ідэале) як тварэнне быцця, з'ява культуры існуе ў працэсе зносін, у працэсе чытання, па-за часам і па-за прасторай дзеля тварэння і ўдасканалення быцця, творыць дасканалае быццё і чалавека. «Как время для начинавшего историю осмысления письменности Платона есть "подвижный образ вечности", так книга у завершителей этой линии мыслительных, культурных традиций есть подвижный образ времени. Она связывает эмпирию со смыслом и в каждом печатном знаке, с каждым следующим словом, каждой перевернутой страницей снова и снова дает, закончу словами Борхеса, "скромный урок" посильного смыслотворчества» [4, с. 90].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Статычнасць дакумента – толькі яго наяўнасць, фіксацыя вынікаў – і ў гэтым яго пасіўнасць. Дынаміка кнігі, яе актыўнасць не толькі з'ява, але і бясконцы працэс. «Можно сказать, книга (Книга) всегда уже есть как возможность любой – другой или следующей – книги…» [4, с. 83].

Ці раскрываюць у поўным аб'ёме знакавасць і семантычнасць, як уласцівасці кнігі (у дакументазнаўстве) той агромісты пласт пісьма і мовы, замацаваных у ёй, якія з'яўляюцца важнейшымі вызначальнікамі і індыкатарамі чалавечай культуры [9], творачымі яе, чалавека, нацыі? Разглядаючы ўласцівасці кнігі і дакумента, сярод якіх знакавасць і семантычнасць займаюць адну з галоўных пазіцый, дакументазнаўцы з прычыны камунікацыйна-інфармацыйнага падыходу не паглыбляюцца ў ролю і прызначэнне сэнсаў, толькі канцэнтруюць увагу на спосабе перадачы інфармацыі. Але ў выніку гэтыя ўласцівасці кнігі – знакавасць і семантычнасць – праяўленні культуры, а кніга – яе важнейшы фактар. Трэба адзначыць, што існуе і іншы пункт погляду, не столькі звязаны з «культурнай функцыяй».

Гэтым прыкладам хацелася б толькі падкрэсліць тое, што кніга – гэта не толькі і не столькі разнавіднасць дакумента, не толькі тэкст, а тэкст – гэта не толькі асобны дакумент ці дакументы, што складаюць кнігу, «…книга и ее метонимические заместители, фрагменты (цитаты), символы (знак, буква) – это метафоры ценности (ценности книги как парадигматического образа смысла, субъективного смыслополагания – воли субъекта к смыслу, к его пониманию – как самодостаточной ценности)» [4, с. 85].

Кніга як з'ява і працэс тварэння мае дастаткова самастойную сферу – кніжную культуру, якая прэзентуе ўніверсум культуры, што прадвызначае выкарыстанне і іншых даследчых катэгорый, як, напрыклад, сутнасных – каштоўнасны канцэпт (кніга як універсум культуры фіксуе каштоўнасці і сама з'яўляецца каштоўнасцю, пачынаючы з пісьма і мовы), феномен жыццяздольнасці кнігі, пераемнасць (і захаванне пераемнасці) кніжнай спадчыны, разнастайнасць і адначасова інварыянтнасць кніжнай культуры на яе духоўным, матэрыяльным і мастацкім узроўнях [2].

Сучасная навуковая бібліялагічная парадыгма «кніжнай культуры» дазваляе па-новаму ацаніць і выйсці на іншы ўзровень асэнсавання і пазнання кнігі, у тым ліку і кніжнай камунікацыі; «…интегрированно исследовать мир книг как своего рода целостную систему» [20, с. 49], а параўноўваючы з іншымі з'явамі культуры – паказаць значнасць кніжнай культуры для развіцця цывілізацыі, сёння яшчэ не поўнасцю ацэненую [8, с. 19].

Як адзначае Кшыштаф Мігань, «кніжная культура» можа быць цэнтральным паняццем для розных уяўленняў: тэарэтычных (тэорыя кнігі як прадмета, інструмента і функцый у культуры), гістарычных (гісторыя кніжнай культуры розных эпох), тэрытарыяльных (кніжная культура гарадоў, рэгіёнаў, краёў, дзяржаў, нацый і г. д.), асобасных (кніжная культура чалавека ад дзіцячага да сталага ўзросту), калектыўных і сацыяльных (кніжная культура сацыяльных класаў, прафесіянальных і рэлігійных груп і г. д.), прагнастычных і інш. [8, с. 19].

Аўтары сучасных канцэпцый метатэорыі інфармацыі, філасофіі інфармацыі, як А. В. Сакалоў [13, 14], прызнаюць, што з упарадкаваннем тэрміналогіі, пабудовай агульнай тэорыі дакумента, толькі ў паўнавар-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тасным супрацоўніцтве навук дакументна-кнігазнаўчага цыкла магчымы выхад і вырашэнне наспеўшых праблем. Кіруючыся вызначанымі яшчэ М. Куфаевым напрамкамі (у працах «Проблемы философии книги», 1924; «Книга в процессе общения», 1927), прапануецца ўлічваць псіхалогію і сацыялогію чытання, патрэбнасці і зацікаўленні чытачоў, іх каштоўнасныя арыентацыі і нацыянальна-культурныя традыцыі і г. д., каб наблізіцца да адказу на пытанне – навошта і для чаго ўсё ў цывілізацыйным развіцці чалавецтва.

«…Природа, человек и книга составляют величайшую жизненную триаду. Самоограничение автора через неполную выразимость мысли в слове, данном в социальной среде, и "окарнание" мысли его раскрепощается в материальной природе книги через творческое воплощение этой неполной мысли и самое слово книги наполняется в общественном процессе чтения, переживания и поведения содержанием, вскрывающим в итоге все мысли автора, читателя, критика, общественного деятеля. И наполнение это идет через весь мыслимый процесс книги в пространстве и времени. Отсюда проблема жизни и человека как существа общительного сливается с проблемой книги. И решить эту проблему в науке, литературе, технике и жизненной среде столько же долг, сколько и подвиг человека», – адзначае М. Куфаеў [5, с. 158–159].

Каб кніжнасць стала апорай гуманізацыі ў эпоху глабалізацыі – праз зацвярджэнне ў грамадскай свядомасці гуманістычных ідэалаў свабоды і талерантнасці, сацыяльнай справядлівасці, творчай самарэалізацыі і гарманічнага развіцця асобы, а толькі гэты шлях бачыцца як выхад з духоўнага, культурнага і сацыяльнага крызісу [13, с. 44] – «дробязей» не можа быць і ў фарміраванні навуковых паняццяў і тэрмінаў, канцэпцый, звязаных з чалавечымі, а значыць, культурнымі каштоўнасцямі, сярод якіх і веды.

Адным жа з галоўных, на наш погляд, кірункаў у гэтым працэсе, як і ў прадмеце кніжнай культуры, з'яўляецца аксіялагічны, каштоўнасны складальнік кніжнага свету [2, 3], аснова якога – мова, пісьмо, пісьменнасць і мастацтва як цэласнасць і як спецыфічны кагнітыўны патэнцыял, які рэалізуецца ў працэсах успрымання кнігі, у бясконцых канкрэтызацыях і новых прачытаннях, у засваенні ведаў і іх перадачы.

1. *Абрамовіч, П.* Вада точыць камяні / П. Абрамовіч [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://arche.by/by/39/20/5999/Вада-точыць-камяні.htm. – Дата доступу: 10.06.2011.

2. *Довнар, Л. И.* Белорусская книга как универсум национальной культуры / Л. И. Довнар // Knygotyra. – 2010. – T. 54. – P. 161–172.

3. *Довнар, Л. И.* Книжная культура как философско-культурологическая категория библиологии (к постановке проблемы) / Л. И. Довнар // Наука о книге: Традиции и инновации: К 50-летию сборника «Книга. Исследования и материалы» : материалы XII Междунар. науч. конф. по проблемам книговедения, Москва, 28–30 апр. 2009 г. : в 4 ч. – М. : Наука, 2009. – Ч. 1. – С. 462–465.

4. *Дубин, Б.* Хартия книги: книга и архикнига в организации и динамике культуры / Б. Дубин // Слово – письмо – литература. Очерки по социологии современной культуры. – М. : Новое литературное обозрение, 2001. – С. 82–90.

5. *Куфаев, М. Н.* Проблемы философии книги. Книга в процессе общения / М. Н. Куфаев. – М. : Наука, 2004. – 192 с. – (Книжная культура в мировом социуме: теория, история, практика).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*6. Кушнаренко, Н. Н.* Документоведение : учебник / Н. Н. Кушнаренко. – 2-е изд., перераб. и доп. – Киев : Т-во «Знання» : КОО, 2000. – 460 с. – (Вища освіта XXI століття).

*7. Лютов, С. Н.* Наука о книге в начале XXI в.: время компромиссов / С. Н. Лютов // Берковские чтения. Книжная культура в контексте международных контактов : материалы Междунар. науч. конф., Минск, 25–26 мая 2011 г. – М. : Наука : Фонд «Книжная культура», 2011. – С. 220–223.

*8. Мігань, К.* Стан сучаснага кнігазнаўства як навукі / К. Мігань // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. – Мінск : БДУКМ, 2008. – Вып. 2. – С. 10–38.

*9. Мигонь, К.* Письмо и язык как определители и индикаторы книжной культуры / К. Мигонь // Наука о книге: Традиции и инновации: К 50-летию сборника «Книга. Исследования и материалы» : материалы XII Междунар. науч. конф. по проблемам книговедения, Москва, 28–30 апр. 2009 г. : в 4 ч. – М. : Наука, 2009. – Ч. 1. – С. 490–491.

*10. Можейко, М. А.* Книга как культурный символ / М. А. Можейко // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. : у 2 ч. – Мінск : БДУКМ, 2006. – Ч. 2. – С. 49–52.

*11. Отле, П.* Трактат о Документации / П. Отле ; пер. с фр. Р. С. Гиляревского // Библиотека, библиография, документация : Избранные труды пионера информатики. – М. : ФАИР-ПРЕСС : Пашков дом, 2004. – С. 187–309.

*12. Плешкевич, Е. А.* Формирование научных концепций о документальных фазах информации. Гносеологическая и управленческая концепции документа / Е. А. Плешкевич // Научно-техническая информация. Сер. 1. – 2010. – № 12. – С. 1–21.

*13. Соколов, А. В.* Документология как метатеория документной коммуникации / А. В. Соколов // Книга. Исследования и материалы. – 2009. – Сб. 91, ч. 1–2. – С. 43–49.

*14. Соколов, А. В.* Философия информации : профессионально-мировоззренческое учеб. пособие / А. В. Соколов. – СПб. : СПбГУКИ, 2010. – 367 с.

*15. Фокеев, В. А.* Библиография : теоретико-методологические основания : учеб. пособие / В. А. Фокеев. – СПб. : Профессия, 2006. – 352 с.

*16. Швецова-Водка, Г. Н.* Документ в свете ноокоммуникации : науч.-практ. пособие / Г. Н. Швецова-Водка. – М. : Литера, 2010. – 384 с.

*17. Швецова-Водка, Г. Н.* Общая теория документа и книги : учеб. пособие / Г. Н. Швецова-Водка. – М. : Рыбари ; Киев : Знання, 2009. – 487 с.

*18. Grabowska, M.* ARTA. Informacja – ten niezwykły przedmiot badań. Od bibliologii do nauki o informacji / M. Grabowska // Bibliologia i informatologia. – Warszawa, 2011. – S. 189–202.

*19. Migoń, K.* Paul Otlet o bibliologii, książce i dokumencie / K. Migoń // Przestrzeń informacji i komunikacji społecznej. – Kraków : Wyd. Uniwersytetu Jagiellońskiego, 2004. – S. 370–376.

*20. Migoń, K.* Парадигмы науки о книге двести лет тому назад и сегодня / K. Migoń // Knygotyra. – 2010. – T. 54. – P. 44–53.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*L. DOUNAR*

## A BOOK AND A DOCUMENT IN THE CONTEXT OF COGNITIVE AND AXIOLOGICAL APPROACH

*The article deals with such theoretical issues as a book, a document, its historical and cultural context, the understanding of its value and significance, the change of its essence: is it a scientific or a human problem? Spirituality,*

*morality, freedom of speech in detection of the place and the role of the book and the document in social development, activity and passivity of the book and the document in the context of their functioning and destination, the role of the document in the sphere of life management, the book as the creation of existence are considered in the article. The autonomy of "the book" through its cognition in a book culture, through the knowledge which is necessary for the human society development is emphasized.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 20.03.2015.

УДК [002.2-028.42+378.091.64]:159.955

*Н. Ю. ВАЙЦЕХОВИЧ*

## УЧЕБНАЯ КНИГА В СИСТЕМЕ ФОРМИРОВАНИЯ ПРОФЕССИОНАЛЬНОГО МЫШЛЕНИЯ СТУДЕНТОВ

*Учебная книга рассматривается в контексте управления познавательной деятельностью обучающихся. На основе обобщения научной информации о сущности профессионального мышления, его видах, психофизиологических механизмах развертывания мыслительной деятельности предлагается общий алгоритм формирования профессионального мышления студентов, который можно реализовать в учебной книге. Представлена комплексная характеристика основных механизмов и условий формирования профессионального мышления, включенных в содержательную и дидактическую подсистему учебной книги.*

Одной из важнейших задач современного высшего образования является подготовка специалиста, способного прогнозировать ситуации, аналитически перерабатывать информацию, для которого творческая активность могла бы стать неотъемлемой частью решения повседневных практических задач. Учебная книга является уникальным образовательным средством, в котором заложены механизмы индивидуальной коммуникации с читателем на основе процессов восприятия, логической обработки, интерпретации изложенной информации. Это сущностное свойство книги позволяет эффективно использовать ее для управления познавательной деятельностью студентов, организации творческого сотрудничества с автором и обучения оценочно-аналитическим процедурам работы с текстом.

В системе высшего образования существует высокий запрос на учебные издания, которые могут не только адекватно передать содержание образовательных программ, но и перевести обучаемого на уровень самостоятельного решения проблемно-поисковых задач. Рассматривая учебную книгу как средство формирования профессионального мышления, необходимо учитывать ее многофункциональность, исходить из понимания ее как сложной системы, включающей не только содержательную, но и процессуальную сторону, которая связана с управлением познавательной деятельностью обучающихся. Такое представление об учебной

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ